№ 18 – 19 (935 – 936)
Май 2023 года

# Краязнаўчая газета

Выдаецца з красавіка 2003 года

*Сябры! 25 мая заканчваецца падпіска на чэрвень 2023 г.
Не забудзьце падпісацца на «Краязнаўчую газету». Будзем разам!*



*Янка Маўр. Кактэбель 1958 г.*

*«...Цікавілі іх розныя далёкія краіны, дзікуны, індзейцы, якіх цяпер бадай ужо зусім няма. Захапляліся рознымі прыгодамі з іх жыцця, што адбываліся гадоў 60 – 80 назад. Марылі пра пальмы, джунглі, а не бачылі добрай пушчы, якая была за некалькі дзясяткаў кіламетраў ад іх. Уяўлялі сабе розныя паляванні на тыграў, сланоў, ільвоў, а вавёркі на волі не бачылі. Марылі пра мора, караблі, а не бачылі вялікага возера, якое ляжала за кіламетраў дваццаць ад іх.*

*У краязнаўчым гуртку яны даведаліся, што ў Беларусі наогул, а ў іх раёне асабліва, ёсць шмат куткоў, не горшых ад заморскіх. Ёсць пушчы, не менш цікавыя, чымся далёкія трапічныя лясы. Ёсць азёры і балоты, якія ўвесну робяцца морамі. Ёсць звяры, якія радзей сустракаюцца на свеце, чым сланы і тыгры».*

*Янка Маўр. «Палескія рабінзоны»*

# 40 цікавых фактаў пра Янку Маўра

***11 мая споўнілася 140 гадоў з дня нараджэння Янкі Маўра (Івана Міхайлавіча Фёдарава) – аднаго з самых загадкавых пісьменнікаў у гісторыі беларускай дзіцячай літаратуры. Яго па праве называюць беларускім Жулем Вернам і Міклуха-Маклаем у адной асобе. Працуючы настаўнікам у школе, ён добра ведаў псіхалогію дзяцей, разумеў іх прагу да невядомага, да цікавых падарожжаў і незвычайных прыгод. Ды і само жыццё пісьменніка было насычана цікавымі фактамі, якія варта згадаць.***

**1. Сапраўднае прозвішча Івана Міхайлавіча Фёдарава (Янкі Маўра) Ільін.** Пісар вайсковай часці запісаў бацьку пісьменніка, адстаўнога салдата Міхаіла Фёдаравіча Ільіна скарочана – Міхаіл Фёдараў. Гэтае прозвішча атрымаў і яго сын – Янка.

**2. У дзяцінстве Янка перахварэў на цяжкую хваробу**. Хлопчык рос у беднасці і нястачы, але адчуваў сябе шчаслівым, бо поруч была клапатлівая маці. Яна выхадзіла сына ад воспы, якая касіла людзей. Адзнакі гэтай хваробы засталіся на твары пісьменніка на ўсё жыццё.

**3. Не звар'яцеў і не памёр ад укусу шалёнага сабакі.** Дзяўчынка, якую пакусаў той самы сабака, памерла. І, канечне, ніякія намаганні, звароты да лекараў не дапамаглі б, калі б сам Янка не прамыў адразу пакусаную руку ў бочцы са шчолаччу.

**4. Вучыўся ў Ковенскім рамесным вучылішчы на слесара, дзе захапіўся кнігамі.** Любімымі аўтарамі Янкі сталі Майн Рыд, Фенімор Купер, Жуль Верн, Густаў Эмар, Луі Бусенар. Яны адкрывалі новыя краіны, клікалі ў цікавыя падарожжы. Вось тады ў яго галаву трапіла *«самая геніальная ідэя»* – адправіцца ў падарожжа вакол свету, вакол усіх кантынентаў, праехаць на лодцы па вялікіх рэках сусвету.

**5. Мог быць застрэлены пад час юнацкіх гульняў у вучылішчы**. Янка цудам пазбегнуў смерці. Адзін з навучэнцаў прынёс аднекуль наган і стаў наводзіць то на аднаго, то на другога хаўрусніка і націскаў на спуск. Дайшла чарга і да Янкі. Сябра цэліў яму ў лоб, але раптам над іх галавамі завішчэлі пацукі, і хлопец ускінуў наган угору і спусціў ударнік. Пачуўся стрэл – адзін патрон у барабане быў...

**6. Вучыўся ў Панявежскай настаўніцкай семінарыі, але быў выключаны за паўгода да заканчэння.** Янка быў выключаны за вальнадумства і *«за сумненні ў рэлігіі»*. Аднак пасведчанне настаўніка пачатковай школы (1903 г.) ён усё ж атрымаў, здаўшы экстэрнам экзамены за семінарскі курс. Працаваць пачынаў памочнікам настаўніка ў мястэчку Новае Месца, затым быў пераведзены ў вёску Бытча на Барысаўшчыне.

**7. На першыя заробкі набыў такую рэдкую ў тыя часы рэч, як ровар**. Ровар на колах з шынамі чырвонай гумы з'яўляецца ў розных куточках Барысаўшчыны і далей яе. У гэты час настаўнік знаёміцца з Алімпіядай – маладой сімпатычнай дзяўчынай з вёскі Верхмень. Яе бацька, айцец Уладзімір, мае там прыход. У тыя ж часы ў Верхменскай школе настаўнічае Кастусь Міцкевіч, таксама малады настаўнік. Але сустрэцца ў Верхмені настаўнікам не давялося.

**8. Разам з Якубам Коласам удзельнічаў у настаўніцкім з'ездзе ў 1906 г. у вёсцы Мікалаеўшчына.** З'езд быў выкрыты паліцыяй, дакументы канфіскаваныя, пачалося следства. На допытах удзельнікі з'езда, у тым ліку і Фёдараў, сцвярджалі, што трапілі на гэтае мерапрыемства выпадкова, стараліся заблытаць справу, звесці з'езд да звычайнай вечарынкі, на якой самую рэвалюцыйную справу адыграла гарэлка. Аднак у рапарце інспектара Кваснецкага адносна І. Фёдарава падаецца наступнае: *«Его участие в учительском митинге в с. Никольске было, по моему мнению, не случайное, и его шутливо-насмешливое объяснение, которым он хочет прикрыть свою невиновность, далеко не говорит в его пользу, а напротив, свидетельствует о том, что он едва ли не главную роль сыграл на этом учительском съезде»*. Фёдарава да педагагічнай працы не дапусцілі і ўзялі пад нагляд паліцыі. А Якуба Коласа 15 верасня 1908 г. асудзілі да трох гадоў турэмнага зняволення.

**9. З'яўляецца прататыпам Івана Тадорыка – аднаго з герояў трылогіі Якуба Коласа «На ростанях».** *«Шырокі лоб і авал твару з вастраватым падбародкам,* – пісаў Якуб Колас, – *казалі за тое, што Іван Тадорык, як відаць, чалавек з выдатнымі здольнасцямі... Іван Тадорык меў штосьці агульнае з нямецкім філосафам-песімістам Шапенгаўэрам»*.

**10. Добра іграў на скрыпцы**. *«Манера трымаць скрыпку і смык і сама іграй сведчылі аб тым, што Іван Тадорык быў добрым скрыпачом»*, – пісаў Якуб Колас. Граць навучыўся ў настаўніцкай семінарыі. Яго ўласная скрыпка экспануецца на літаратурна-дакументальнай экспазіцыі ў музеі Якуба Коласа.

**(Заканчэнне на стар. 8 і 9)**

# пра Янку Маўра

Таварыства ваяўнічых тэхнікаў (ТВТ) гурткі тэвэтэтаўцаў ствараліся не толькі ў гарадах Беларусі, але і ў Іванаве, Стаўрапалі, Петразаводску і інш. Кніга была перакладзена на армянскую, латышскую, літоўскую, малдаўскую, польскую, рускую мовы.

**24. У 1934 г. на Усебеларускім конкурсе дзіцячай кнігі Янка Маўр атрымаў першую прэмію за аповесць «ТВТ», але на рускую мову яна была перакладзена толькі ў 1956 г.** У 1934 г. выходзіць «самы піянерскі» твор Янкі Маўра з дзіўнай назвай: «ТВТ, або Апавяданне пра тое, як піянеры ўзбунтаваліся супроць уціску рэчаў і здзівілі ўвесь свет, як яны навучыліся бачыць тое, чаго іншыя не бачаць, і як Цыбук здабываў ачкі». У лісце да перакладчыка Анатоля Тонкеля Янка Маўр пісаў: *«У нас книга издавалась много раз, но для русского издания она не подходила, как идейно порочная. Ибо ни в каких инструкциях не сказано, что такие "организации", как ТВТ, могут существовать. Да и сама идея напоминает Тимуровскую. А ТВТ написана за 4 года до Гайдара. Лет пять тому назад в Бресте и ближайших городах в широком масштабе "вспыхнуло" движение ТВТ. Общественность обратила на него внимание, и приветствовала его. Брестский горсовет вызвал к себе руководителей, обещал помочь. Я получил "с фронта" интереснейшие письма. Но опасность своевременно была замечена руководством комсомола (Москва, Минск) и пресечена в корне. Вот почему я не верю, что Вам удастся протащить зловредную книгу»*.

**25. На I Усесаюзны з'езд савецкіх пісьменнікаў 1934 г. Янка Маўр атрымаў персанальнае запрашэнне ад Максіма Горкага.** Ён згадваў: *«Перад Першым з'ездам ССП у беларускі арганізацыйны камітэт прышоў старшынёй М. Клімковіч. Аднаго разу выклікае мяне.*

*– Ці праўда, што ў вас ёсць выданы кнігі? – пытаецца ён.*

*– Ёсць, – кажу, – не адна, нават тоўстыя.*

*– Пакажыце, калі ласка.*

*Прынёс яму штук шэсць. Здзівіўся старшыня надзвычайна. Прышоў час з'езда. Выбралі дэлегацыю, у якой было працэнтаў дваццаць пачэсных пісьменнікаў. Надышоў час ад'езда – і раптам з Масквы паведамляюць, што Горкі прасіў, каб узялі на з'езд... Маўра! Можна сабе ўявіць, як здзівіліся нашы кіраўнікі!»*.

**26. Творы Янкі Маўра вырataвалі яму жыццё ў 1936 – 1937 гг.** У тыя гады найперш за сувязі з замежжам у спіс «шпіёнаў і ворагаў народа» трапілі сябры пісьменніка – эсперантысты. У адпаведныя органы былі выкліканы і Янка Маўр, які ўжо чакаў свайго арышту. Але на шчасце, следчы быў адным з яго чытачоў, і калі даведаўся, што перад ім любімы пісьменнік – Янка Маўр, сказаў: *«Ідзіце і не хвалюйцеся. Больш вас чапаць не будуць»*.

**27. Цяжкія гады эвакуацыі ў час Вялікай Айчыннай вайны перажыў у Алма-Аце.** У фондах Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа захоўваецца перапіска Янкі Маўра з Якубам Коласам часоў вайны. У лістах пісьменнікі дзяліліся сваімі перажываннямі, творчымі планамі, марамі, радасцямі і горам, падтрымлівалі адзін аднаго ў цяжкія моманты жыцця на чужыне, іх перапіска – пацвярджэнне сапраўднага сяброўства.

**28. У Казахстане здымаўся ў кіно, каб зарабіць грошы.** Свой першы заробак у Алма-Аце (93 рублі) атрымаў за артыстычную дзейнасць. Здымаўся ў масоўках фільмаў «Поход Ворошилова», «Молодое вино».

**29. Даслаў Ц. С. Гарбунову ў Маскву сваю п'есу «Лицо зверя». Рукапіс да гэтага часу не знойдзены.** Янка Маўр у 1942 г. у лісце да Якуба Коласа пісаў: *«"Лицо зверя". Пьеса в 3-х актах (5 картин). Перевод с белорусского. Такой твор послан мною в Москву Горбунову. Я довольствуюсь тем моральным удовлетворением, которое дала мне эта работа; я рад, что успел сказать и своё слово, может быть, последнее. А из особенностей этой пьесы по крайней мере одна является безусловно выдающейся: пьеса состоит только из одного перевода, а оригинала не существует и не существовало в природе. Только тебе доверяю я эту историческую тайну»*.

**30. Зрабіў падарунак самому сабе.** Сам сабе купіў партфель і зрабіў на ім гравіроўку: *«Паважанаму Янку Маўру на памяць аб яго 20-гадовай бескарыснай літаратурнай дзейнасці – ад І. М. Фёдарава. 1943»*. Партфель захоўваецца ў Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры.

**31. Пінскі абласны тэатр адкрываў сезон 1947 г. п'есай Янкі Маўра «Шляхі дарогі».** Што гэта за п'еса, невядома.

**32. Перакладаў на беларускую мову творы сусветнай літаратуры.** У перакладзе Янкі Маўра на беларускую мову выйшлі творы Р. Кіплінга, М. Твэна, Ж. Верна, В. Гюго, казкі Г. Х. Андэрсэна, асобныя творы Д. Маміна-Сібірака, М. Прышвіна, А. Гайдара.

**33. Быў сватам Якуба Коласа.** Малодшы сын Якуба Коласа Міхась ажаніўся з дачкой Янкі Маўра Наталляй, якая пакінула цікавую кнігу «Доўгая дарога ад дома Янкі Маўра да дома Якуба Коласа». А Якуб Колас прысвяціў свайму свату некалькі жартоўных вершаў.

**34. Працаваў над кнігай «Ніколі не забудзем».** У 1948 г. пад рэдакцыяй Янкі Маўра выйшаў зборнік «Ніколі не забудзем» – хваляючая і драматычная кніга ўспамінаў беларускіх дзяцей, удзельнікаў і сведкаў Вялікай Айчыннай вайны. Прадмову да кнігі напісаў Якуб Колас.

**35. Амаль сляпы, выратаваў дзяўчынку, якая танула.** У Янкі Маўра дактары знайшлі катаракту, але ў той час рабілі аперацыю толькі тады, калі катаракта выспее. І па сутнасці напаўсляпому чалавеку даводзілася доўгі час чакаць гэтага «выспявання». Слых жа быў у яго неверагодна тонкі. Аднойчы, калі грэўся на сонцы на мужчынскім пляжы Кактэбеля, пачуў крыкі – танула дзяўчынка, ён кінуўся на дапамогу і выцягнуў дзяўчынку з вады. Занёс яе на жаночы пляж, там яе адкачалі. На некалькі дзён стаў героем Кактэбеля. Захаваўся фотаздымак гэтай дзяўчынкі з удзячным подпісам. Так амаль сляпы Янка Маўр, якому ў той час было каля 70-і, выратаваў жыццё дзіцяці.



*Янка Маўр. 1954 г.*

**36. Лячыў хворых ад эпілепсіі.** А. Міронаў натknуўся на апісанне даўняга рэцэпта вылечвання людзей ад эпілепсіі і прапанаваў Янку Маўру паспрабаваць самім лячыць хворых, а калі вынікі лячэння будуць станоўчымі, звярнуцца ў Міністэрства аховы здароўя. Рэцэпт заключаўся ў выкарыстанні костачак, што знаходзяцца за вушамі ў малочных парасят. Калі ж пацыентаў набралася каля сотні, яны падлічылі, што дапамаглі працэнтам васьмідзесяці. Як вядома, савецкая медыцына ставілася адмоўна да народных метадаў, нават правераных стагоддзямі. Займацца лячэннем забаранілі.

**37. Любіў піць каву з каньяком.** У яго кватэры была добрая калекцыя каньякоў. Але Маўр выпівохам не быў. Ужываў каньяк па лыжцы з кавай.

**38. Адкрыта прызнаваў свае недахопы ў літаратурнай творчасці.** *«Свае недахопы я ведаю: 1) Досыць шурпаты і сухаваты стыль; няма ў ім той пявучасці, якая, скажам, у Лынькова. 2) Празмерная скупасць у апісаннях; калі я раблю адзін ці два мазкі, то болей ужо не магу – мне здаецца, што будзе нудна. Мая проза чыста апавядальная, а не "мастацкая" (апісальная). 3) Небагаты слоўнік. 4) Уплывы крыху залішняй "впечатлительности", якая часам адводзіць убок»* (з ліста Янкі Маўра да Алеся Якімовіча).

**39. Пачынальнік фантастычнага жанру ў беларускай літаратуры.** Казка «Вандраванне па зорках» Янкі Маўра выйшла ў 1927 г., а аповесць «Фантамабіль прафесара Цылякоўскага» – у 1955-м.

**40. Збіраўся напісаць пра зорныя войны.** Задумаў раман «Апошнія з Эрыды», які павінен быў складацца з дзвюх частак: «Дачка неба» і «Гібель планеты».












*Марыя і Васіліна МІЦКЕВІЧЫ, унучка і праўнучка Янкі Маўра*

Газета зарэгістравана ў Міністэрстве інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 384 ад 08 мая 2014 г.
Заснавальнікі:
грамадскае аб'яднанне «Беларускі фонд культуры»; Гілеп Уладзімір Аляксандравіч.

Краязнаўчая газета

Індэкс індывідуальнай падпіскі – 63320
ведамасны – 633202

**Галоўны рэдактар – Максім Навумавіч ГАЛЬПЯРОВІЧ.**
Адказны сакратар Алесь Сачанка.
Рэдкалегія: Уладзімір Гілеп (старшыня), Анатоль Бутэвіч, Навум Гальпяровіч, Радзім Гарэцкі, Ганна Запартыка, Павел Каралёў, Алесь Карлюкевіч, Аляксандра Кравец, Ігар Пракаповіч, Павел Сапоцька, Віктар Скорабагатаў, Тадэуш Стружэцкі, Аляксандр Суша.

Наш адрас:
220020, г. Мінск,
вул. Ціміразева,
121/4, пам. 414.
Тэл. 364-42-03
E-mail:
kraga@tut.by